# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## ТРЭЦІ (АБЛАСНЫ) ЭТАП XXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ. 2012/13 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

### XI КЛАС

**Заданне 1.** Перакладзіце на беларускую мову сказы з рускім словам *нет*.

Максімальная колькасць балаў – 5
(1 бал – за кожны дакладна прыведзены пераклад).

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) У меня *нет* времени. | |
| 2) Этого не было, *нет* и не будет. | |
| 3) Ты пойдёшь или *нет*? | |
| 4) Свести на *нет*. | |
| 5) Я его предупреждал дважды, так *нет*, всё мало. | |

**Заданне 2.** Падкрэсліце ў кожным радзе слова(ы) з арфаграфічнымі памылкамі.

Максімальная колькасць балаў – 5
(1 бал – за кожнае падкрэсленае слова з арфаграфічнай памылкай).

1) чацьвярціна, більярд, павільён, ін’екцыя, пьедэстал;

2) майстар, менеджэр, дэталь, Юпітэр, агрэсіўны;

3) васьмісоты, соракагоддзе, фатакамера, галоўнакамандуючы, Вялікабрытанія.

**Заданне 3.** Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу адзіночнага і множнага ліку.

Максімальная колькасць балаў – 5
(0,5 бала – за кожную правільную форму).

Узор: спаць – спі, спіце.

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1) дбаць | | |
| 2) слаць | | |
| 3) віць | | |
| 4) заходзіць | | |
| 5) усаджвацца | | |

**Заданне 4.** Перакладзіце фрагмент з прадмовы Францыска Скарыны да кнігі “Іоў” на сучасную беларускую мову.

Максімальная колькасць балаў – 5.

И всякому человеку потребна чести, понеже ест зерцало жития нашего, лекарство душевное, потеха всем смутным, наболей тым, они же суть в бедах и в немощах положены.

Прото ж и я, Францишек, Скоринин сын с Полоцка, в лекарскых науках доктор, знаючи сее, иже ест наивысшая мудрость и познание самого себе, казал есми тиснути книгу святого Иова рускым языком Богу ко чти и людем посполитым к научению.

Пераклад: ________________________________.

**Заданне 5.** Запоўніце табліцу. Абазначце словаўтваральныя сродкі, укажыце спосаб утварэння новага слова.

Узор: вучань → вучн-*ёўск*-і (*суфіксальны*).

Максімальная колькасць балаў – 5
(0,5 бала – за кожную дакладна названую пазіцыю).

| Утваральнае слова | Вытворнае (утворанае) слова | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| 1) | варатар | |
| 2) | выбух | |
| 3) | высакарослы | |
| 4) | даўгагрывы | |
| 5) | заваяваць | |

**Заданне 6.** Паданне сведчыць, што жыў (яшчэ за князем Дрыгайлам) адзін купец. Адправіўся ён за мора, завёз за граніцу жыта, выменяў яго на мыла і, каб не плаціць мытнікам, вырашыў правезці тавар кантрабандай, схаваўшы на самым дне карабля, каб не знайшлі. Але ў дарозе вада пратачвалася праз дно, і дадому купец давёз хіба што абмылкі.

Запішыце прыказку, у якой захавалася прозвішча гэтага купца, патлумачце яе значэнне. Прывядзіце беларускія прыказкі, прымаўкі, фраземы, у якіх выкарыстоўваецца імя чалавека.

Максімальная колькасць балаў – 5.

1) Прыказка, якая захавала прозвішча “легендарнага” купца: ________________________.

2) Значэнне прыказкі: ________________.

3) Фразеалагізмы з імем чалавека (не менш за тры адзінкі): ___________________________.

**Заданне 7.** Вызначце сінтаксічную ролю слова *так*.

Максімальная колькасць балаў – 5
(1 бал – за кожную правільна вызначаную ролю слова *так* у сказе).

| Сказы | Сінтаксічная роля слова *так* |
|---|---|
| 1) Яе чорныя вочы, белы твар і гэта чароўная ўсмешка *так* і стаялі перад ім, як намаляваныя (Якуб Колас). | |
| 2) Выходзіла *так*, што староста казаў праўду (Якуб Колас). | |
| 3) І чаму ўсё гэта *так* скончылася? Чаму?.. (Якуб Колас). | |
| 4) Дзеці разварушыліся, павесялелі і выйшлі з таго стану замкнёнасці, у якім яны яшчэ *так* нядаўна былі (Якуб Колас). | |
| 5) І вось на гэтай дарозе ўжо ўстала адна перашкода... Але ці *так* гэта? Чаму перашкода? Ці не ёсць гэта адна з тых жыццёвых прыгод, якія аздабляюць жыццё? (Якуб Колас). | |

**Заданне 8.** Адкажыце на пытанні віктарыны.

Максімальная колькасць балаў – 4
(1 бал – за кожны правільны адказ).

**1.** На якую "добрую, карысную для сябе справу" куранёўцы ў рамане "Людзі на балоце" І. Мележа рэагавалі наступным чынам?

– Тут і без таго: куды ні кінь – клін!.. Етаго шчэ толькі і не хапало!..

– І без таго, як уюн круцішся!

– Не мела, грэц яго, баба клопату!

– Столькі сілы ўняць! Перарвацца! Коней замучыць.

– …Жылі, тым часам, і так! І нічога.

Адказ: ____________________.

**2.** У якім творы ёсць структурныя часткі: "Украдзенае маленства" і "Вялікае скрыжаванне"?

Адказ: ____________________.

**3.** Назавіце прозвішчы двух беларускіх пісьменнікаў, якія нарадзіліся ў адным годзе, але не на тэрыторыі Беларусі.

Адказ: ____________________.

**4.** Гэтая кніга духоўнай паэзіі Р. Барадуліна ў 2006 г. была вылучана ксяндзом Уладзіславам Завальнюком на атрыманне Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры.

Адказ: ____________________.

**Заданне 9.** Каму з пералічаных герояў п'есы "Хто смяецца апошнім" К. Крапівы належаць наступныя словы? Суаднясіце прыведзеныя выказванні з адпаведнымі персанажамі. Адказ запішыце ў форме лічбава-літарнага спалучэння (напрыклад, 5е).

Максімальная колькасць балаў – 8 (1 бал – за кожную правільна ўстаноўленую адпаведнасць).

| | |
|---|---|
| **1.** Я так і думаў! Не можа быць, каб вы... такую бязглуздзіцу напісалі. | **а.** Гарлахвацкі |
| **2.** Няхай жа ведаюць усе свінні – мамантавыя і нямамантавыя: калі каторая з іх паспрабуе пакасціць у нашай навуцы, будзем біць проста па пятачку. | **б.** Зёлкін |
| **3.** Учора лёг спаць як чэсны савецкі грамадзянін, а сягоння ўстаў, бачу – нешта няладнае. Некаторыя знаёмыя не пазнаюць мяне, на другі бок вуліцы пераходзяць, калі сустрэнуцца. | **в.** Туляга |
| **4.** На табе тваё дабро назад!.. Праз цябе толькі непрыемнасці чалавеку! | **г.** Чарнавус |
| **5.** Новы поп, дык новае і маленне. У таго дырэктара, бывала, адзін столік, два крэслы, і ўсё. А ў гэтага ж стол гэтакі, а на стале ж мартаплясаў усялякіх панастаўляна... | **д.** Нічыпар |
| **6.** Назначаны дзень мае ганьбы. Адзін падлец будзе публічна прысвойваць сабе працу другога, а другі падлец, праклінаючы ў душы, будзе яму апладзіраваць. | **е.** Вера |
| **7.** Працаваць трэба заўзята. Вось як я, напрыклад, – адпачыць хвіліну часу няма. | **ё.** Цёця Каця |
| **8.** Па-мойму – ты не з таго канца пачаў разбірацца. Трэба пацікавіцца, адкуль ідуць гэтыя плёткі. | **ж.** Левановіч |

Адказ: ____________________.

**Заданне 10.** Вызначце вершаваны памер прыведзеных ніжэй радкоў. Назавіце аўтара і літаратурны твор, з якога ўзяты гэтыя радкі.

Максімальная колькасць балаў – 3
(1 бал – за кожны правільны адказ).

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Аўтар твора: ____________________.
Назва твора: ____________________.
Вершаваны памер твора: ____________________.

**ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ**

* * *

Спее дзень над гаем і над борам,
і душою чуйнаю здаля
азярынаў позірк ясназоры
пазнаеш.
Радзімая зямля!
І як птах крылаты між нябёсаў –
срэбраны і радасны званок, –
на зямлі жывеш высокім лёсам,
верачы – усё тут незнарок.
Незнарок прамень, жывы і тонкі,
што, нібы запозненая ніць, –
павуцінка восеньскай вандроўкі –
на далоні сцішана трымціць.
Над калінай – іней мураговы.
На каліне – выкіслелы жар.
Мне прастор такіх нашэпча словаў.
быццам праўду выкажа
у твар.
Крок за крокам – пушчу расхінаеш!
Крок за крокам – далеч пазнаеш!
Можа, гэта лепшае,
што маеш?
Можа, дзеля гэтага й жывеш?..

Генадзь Пашкоў.

**ДАВЕДКІ**

**Заданне 1.**

| Сказы на рускай мове | Адпаведнікі сказаў на беларускай мове |
|---|---|
| 1) У меня *нет* времени. | 1) *У мяне* ***няма*** *часу (Я не маю часу).* |
| 2) Этого не было, *нет* и не будет. | 2) *Гэтага не было,* ***няма*** *і не будзе.* |
| 3) Ты пойдёшь или *нет*? | 3) *Ты пойдзеш ці* ***не****?* |
| 4) Свести на *нет*. | 4) *Звесці на* ***нішто****.* |
| 5) Я его предупреждал дважды, так *нет*, всё мало. | 5) *Я яго папярэджваў двойчы, дык* ***не****, усё мала.* |

**Заданне 2.**

1) чацьвярціна, більярд, павільён, ін'екцыя, пьедэстал;

2) майстар, менеджэр, дэталь, Юпітэр, агрэсіўны;

3) васьмісоты, соракагоддзе, фатакамера, галоўнакамандуючы, Вялікабрытанія.

**Заданне 3.**

| Неазначальная форма дзеясловаў | Загадная форма дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | Адзіночны лік | Множны лік |
| 1. дбаць | 1. *дбай* | 1. *дбайце* |
| 2. слаць | 2. *сцялі* | 2. *сцяліце* |
| 3. віць | 3. *ві* | 3. *віце* |
| 4. заходзіць | 4. *заходзь* | 4. *заходзьце* |
| 5. усаджвацца | 5. *усаджвайся* | 5. *усаджвайцеся* |

**Заданне 4.**

Прыкладны варыянт перакладу: І ўсякаму чалавеку патрэбны, паколькі з'яўляюцца адлюстраваннем / люстэркам жыцця нашага (у якасці люстэрка жыцця нашага), лекі душэўныя, суцяшэнне ўсім самотным, і найбольш тым, якія ў бедах і ў хваробах знаходзяцца.

Пра тое ж і я, Францішак, Скарынаў сын з Полацка, доктар лекарскіх навук, ведаючы, што ў гэтым і ёсць найвышэйшая мудрасць і пазнанне самога сябе, казаў выдаць (выціснуць) кнігу святога Іова рускай мовай для Боскага шанавання і людзям простым / звычайным для навучання.

Каментарый: За пераклад згодна з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы – мінімум 3 балы. Неабавязкова перакладаць літаральна, дастаткова перадаць асноўную думку. Добра, калі пры перакладзе захаваюцца рысы і пафас канфесійнага стылю.

**Заданне 5.**

| Утваральнае слова | Вытворнае (утворанае) слова | Спосаб утварэння |
|---|---|---|
| 1) *варот-ы* | варат-***ар*** | *суфіксальны* |
| 2) *выбух/ну/-(ць)* | выбух-**Ø**- | *нулявая суфіксацыя* |
| 3) *высок-і рос/т/-* | ***высак***-а-***рос-л***-ы | *асновасклад. + суф.* |
| 4) *доўг-ая грыв-а* | ***даўг***-а-***грыв-Ø***-ы | *асновасклад. + нулявы суф.* |
| 5) *ваява-(ць)* | ***за***-ваява-(ць) | *прыставачны* |

**Заданне 6.**

1) *Зарабіць, як Заблоцкі на мыле* (1 бал).

2) *'Прагарэць у гандлёвых справах, пацярпець фіяска'* (1 бал).

3) *Цікавы, як* ***Марцін*** *да кавы*; *Рабіць наш* ***Васіль*** *не мае сіл, а на клёцкі ў малацэ – за чацвярых валачэ*; *Каму што, а* ***Сымону*** *селядца*; *Аднаго* ***Юрку*** *ўпусцілі, а ўся хата заюрылася*; *І* ***Халімон*** *танцуе, калі яму шанцуе…* (1 бал за адну фразеалагічную адзінку).

**Заданне 7.**

| Сказы | Сінтаксічная роля слова *так* |
|---|---|
| 1) Яе чорныя вочы, белы твар і гэта чароўная ўсмешка *так* і стаялі перад ім, як намаляваныя (Якуб Колас). | *часціца* |
| 2) Выходзіла *так*, што стараста казаў праўду (Якуб Колас). | *акалічнасць* |
| 3) І чаму ўсё гэта *так* скончылася? Чаму?.. (Якуб Колас). | *акалічнасць* |
| 4) Дзеці разварушыліся, павесялелі і выйшлі з таго стану замкнёнасці, у якім яны яшчэ *так* нядаўна былі (Якуб Колас). | *часціца* |
| 5) І вось на гэтай дарозе ўжо ўстала адна перашкода... Але ці *так* гэта? Чаму перашкода? Ці не ёсць гэта адна з тых жыццёвых прыгод, якія аздабляюць жыццё? (Якуб Колас). | *выказнік* |

**Заданне 8.**

1) Будоўля грэблі.

2) "Пошукі будучыні" К. Чорнага.

3) П. Панчанка нарадзіўся ў 1917 г. у Таліне, а Я. Брыль – у гэтым жа годзе ў Адэсе.

4) "Ксты".

**Заданне 9.**

Правільны адказ: 1б, 2ж, 3г, 4д, 5ё, 6в, 7а, 8е.

**Заданне 10.**

Аўтар твора: Я. Купала

Назва твора: "Явар і каліна".

Вершаваны памер твора: дактыль.

Падрыхтавалі
**Вольга ПРАСКАЛОВІЧ,**
**Аляксандр РАДЗЕВІЧ,**
**Ірына САВІЦКАЯ.**